# ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА

аб дысертацыі Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча
«Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны, са спасылкай на вобласць даследавання пашпарту адпаведнай спецыяльнасці, зацверджанага ВАК**

Дысертацыя Бітчанкі С. М. адпавядае спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі, бо з'яўляецца гісторыка-педагагічным даследаваннем, у якім дысертантам зроблена рэканструкцыя гістрычнага мінулага, у прыватнасці, працэса стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., яго апісанне і тлумачэнне ў адпаведнасці з дзяржаўна-ідэалагічнымі і ўласна адукацыйнымі фактарамі, што адпавядае базаваму тыпу такога даследавання (па класіфікацыі Г. Б. Карнэтава) па гісторыі адукацыі. Таксама ў дысертацыі выяўлены погляды прадстаўнікоў навукова-педагагічнай супольнасці беларускіх губерняў адносна выхаваўчай ролі айчыннай (роднай) гісторыі як вучэбнага прадмета, што адлюстроўвае стан педагагічнай думкі ў XIX – пачатку XX ст.

Дысертацыя адпавядае галіне «педагагічныя навукі» і п. 4 вобласці даследавання па пашпарту спецыяльнасці13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі: гісторыя педагогікі і адукацыі (аналіз гістарычнага развіцця інстытуалізаванай і неінстытуалізаванай практыкі адукацыі, дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і яе нарматыўна-прававога рэгулявання; вывучэнне станаўлення і развіцця педагагічных ідэй, канцэпцый, тэорый, педагагічнай спадчыны выдатных педагогаў мінулага).

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Актуальнасць тэмы дысертацыі як гісторыка-педагагічнага даследавання абумоўлена магчымасцю выкарыстання яе вынікаў у сучаснай тэорыі і практыцы школьнай гістарычнай адукацыі Рэспублік Беларусь з улікам сучаснай дзяржаўнай гістарычнай палітыкі і пераемнасці з тэорыяй і практыкай дыдактычнага канструявання вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для агульнаадукацыйнай школы.

**Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Ступень навізны вынікаў дысертацыі заключаецца ў комплексным характары гісторыка-педагагічнага даследавання ўзаемаабумоўленасці канцэптуальна-ідэалагічных, структурна-зместавых, навукова-метадыяных асноў стварэння стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., што актуалізавана сучасным этапам мадэрнізацыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Ступень навізны навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону:

- выкарыстанне досыць шырокай гістарыяграфічна-крыніцазнаўчай базы даследавання для раскрыцця дзяржаўна-ідэалагічных і гісторыка-педагагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, прадстаўленых у іх эвалюцыі;

- стварэнне мадэлі вывучэння эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. як гісторыка-педагагічнай;

- спалучэнне канцэпцый дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне гістарычнай адукацыі з этапамі яе рэалізацыі ў беларускіх губернях пры выяўленні думак прадстаўнікоў навукова-педагагічнай супольнасці беларускіх губерняў адносна выхаваўчай ролі айчыннай (роднай) гісторыі ў фарміраванні патрыятызму і асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў-ураджэнцаў Беларусі;

- увядзенне ў зварот тэрміна «вобразы гістарычнага мінулага Беларусі» з іх зместавай эвалюцыйнай характарыстыкай у школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм;

- правядзенне комплекснага кантэнт-аналізу вучэбных тэкстаў 28 вучэбных выданняў па айчыннай гісторыі для характарыстыкі навукова-педагагічных асноў стварэння і вучэбна-метадычных аспектаў выкарыстання школьнай вучэбнай літаратуры ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі забяспечваюцца:

- сістэмнасцю вывучэння прадмета даследавання ў яго структурных, функцыянальных і працэсуальных характарыстыках;

- выкарыстаннем шырокай гістарыяграфічна-крыніцазнаўчай базы даследавання, у прыватнасці, матэрыялаў 6 архіваў і 3 бібліятэк, які маюць навуковы статус;

- апорай на разнажанравыя дакументы, аўтарскія класіфікацыйныя табліцы і аналітычныя схемы, ілюстрацыйны апарат, што падцвярджаецца матэрыяламі тома II, якія змяшчаюць у сябе 25 дадаткаў і 260 пазіцый у бібліяграфічным спісе;

- правядзеннем комплекснага кантэнт-аналізу вучэбных тэкстаў 28 вучэбных выданняў па айчыннай гісторыі і вучэбных праграм;

- вызначэннем у якасці крытэрыяў кантэнт-аналізу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі зместавых маркераў, якія апасродкавана ці латэнтна сведчылі аб прызнанні (непрызнанні) гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларускага этнасу (нацыі);

- практычнай рэалізацыяй вынікаў даследавання ў адукацыйнай практыцы.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанню**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання, як гісторыка-педагагічнага, заключаецца ў выяўленні аўтарам на базе шырокага круга гісторыка-педагагічных крыніц XIX – пачатку XX ст. працэса канцэптуалізацыі ідэалагічных асноў вывучэння гісторыі Беларусі ў змесце школьнай вучэбнай літаратуры для пачатковай і сярэдняй школы ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі Міністэрства народнай асветы і тэарэтычнымі, практыка-арыентаванымі поглядамі прадстаўнікоў навукова-педагагічнай супольнасці.

Практычная значнасць дысертацыі заключаецца ў выкарыстанні яе вынікаў у адукацыйным працэсе ўстаноў дадатковай адукацыі дарослых і ўстаноў вышэйшай адукацыі, аб чым сведчаць акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ў ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» пры правядзенні перападрыхтоўкі па спецыяльнасці "Педагогіка дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі", у прыватнасці, пры рэалізацыі вучэбнай праграмы "«Дадатковая адукацыя сродкамі музейнай педагогікі"; у ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» пры правядзенні перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Экскурсійная дзейнасць ва ўстановах адукацыі», у прыватнасці, рэалізацыі вучэбнай праграмы «Музейная педагогіка і педагагічныя тэхналогіі ў экскурсійнай дзейнасці»; у УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова» пры правядзенні

лекцыйных, практычных і семінарскіх занятках па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».

Сацыяльна-эканамічная значнасць атрыманых вынікаў даследавання заключаецца ў распрацоўцы дысертантам канцэпцыі музея «Вучэбная кніга ў гісторыі адукацыі» (IX – XX стст.) і яе практычнай рэалізацыі, што зафіксавана ў актах аб практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі ў адукацыйным працэсе ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі».

Сацыяльная значнасць вынікаў даследавання заключаецца ў вывучэнні дысертантам уплыву зместу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі на фарміраванне асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў-ураджэнцаў Беларусі.

Вынікі даследавання магчыма выкарыстаць для вывучэння гісторыі педагагічнай думкі, тэорыі і практыкі гістарычнай адукацыі; дзяржаўна-ідэалагічнага і навукова-метадычнага забеспячэння працэсу стварэння сучаснай школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі; сістэмнага афармлення музейных экспазіцый, прысвечаных вучэбнаму кнігавыданню па гісторыі.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Вынікі і высновы дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 14 публікацыях: 10 навуковых артыкулаў, апублікаваных ў выданнях (рэцэнзаваных часопісах і навуковых зборніках), уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, зацверджаным Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь; 4 публікацыі матэрыялаў міжнародных і рэспубліканскай навуковых і навукова-практычных канферэнцый (педагагічных чытанняў). Агульны аб'ём аўтарскага тэксту апублікаваных работ па тэме дысертацыі складае 10,6 аўт. арк.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Дысертацыя як кваліфікацыйная навуковая работа афармлена ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь (Інструкцыя, зацверджанай Пастановай ВАК Рэспублікі Беларусь 22 жніўня 2023 года № 5).

**Заўвагі па дысертацыі (пры іх наяўнасці), калі яны не паказваюцца ў структурных элементах водзыва аб дысертацыі**

1. Адносна выкарыстання дысертантам паняцця «эвалюцыя» у назве даследавання і яго структурных частках патрабуецца больш выразнае

аўтарскае тлумачэнне гэтага паняцця ў аспекце яго сэнсавага ўжывання прадстаўнікамі навукова-педагагічнай супольнасці ў гістарычнай рэтраспектыве, г. зн. у XIX – пачатку XX ст.

2. Уяўляецца мэтазгодным прадставіць больш выразна аб'ект даследавання, бо ў адпаведнасці з яго спецыфікай як гісторыка-педагагічнага даследавання, дысертантам вывучаюцца дзяржаўна-ідэалагічныя і ў пэўнай ступені сацыяльна-культурныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, а не толькі яна сама ў працэсе свайго эвалюцыйнага развіцця. Разам з тым, можна адзначыць, што мяжа паміж аб'ектам і прадметам менавіта гісторыка-педагагічнага даследвання вельмі часта мае невыразны характар, як гэта адзначаецца вядомым даследчыкам у галіне гісторыі педагогікі, доктарам педагагічных навук, прафесарам Г. Б. Карнэтавым.

3. Карысным было б прадстаўленне дысертантам такіх канцэптаў даследавання, як «школьная вучэбная літаратура па гісторыі Беларусі», «вобраз гістарычнага мінулага Беларусі», «нацыянальная самасвядомасць вучняў-ураджэнцаў беларускіх губернях Расійскай імперыі» не толькі ў заключэнні на сс. 110–111 дысертацыі, а і ў агульнай характарыстыцы работы для больш выразнага разумення канцэптуалізацыі гісторыка-педагагічнага даследавання.

4. Распрацаваная дысертантам гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. пры сваей характарыстыцы атрымала статус кароткіх каментарыяў, размешчаных у п. 1.2 на сс. 19–20 дысертацыі.

5. Вялікі аб'ем дысертацыі ў п. 2.1 займае гістарыяграфічны агляд дакументальных (22 старонкі) і ўласна педагагічных (10 старонак) крыніц даследавання, што ўяўляецца больш характэрным менавіта для ўласна гістарычнага даледавання. Разам з тым, заўважым, што такога падыходу вымагае спецыфіка гісторыка-педагагічнага даследавання, якая абумоўлена зваротам да гістарычна-педагагічных ведаў у XIX – пачатку XX ст.

Выказаныя заўвагі не зніжаюць прызнання навуковай каштоўнасці аўтарскага гісторыка-педагагічнага даследавання па эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. даследавання

**Адпаведнасць (неадпаведнасць) навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Аналіз зместу дысертацыі і аўтарэферата дазваляе канстатаваць, што дысертант Бітчанка С. М. прадставіў да абароны цэласнае, лагічна завершанае сваімі храналагічнымі межамі даследаванне, што сведчыць аб адпаведнасці яго навуковай кваліфікацыі вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.

Вучоная ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі можа быць прысуджана Бітчанка Сяргею Міхайлавічу за сукупнасць навуковых вынікаў.

1. Сутнаснае раскрыцце дзяржаўна-ідэалагічных, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчых і гісторыка-педагагічных асноў даследвання стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, прадстаўленыя ў іх сукупнасці і ўзаемаабумоўленасці.

2. Канструяванне мадэлі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., якая уключае ў сябе канцэптуальна-ідэалагічны (гістарычныя канцэпты, выкарыстоўваемыя як ідэалагемы ва ўрадавай палітыцы), структурна-зместавы (асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры і зместу школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі), навукова-метадычны (навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе) кампаненты.

3. Сэнсава-храналагічнае вызначэнне эвалюцыі канцэптуальна-ідэалагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ва ўзаемасувязі з дзяржаўнай палітыкай Расійскай імперыі ў галіне гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з канцэптамі паланізацыі (1803–1833 гг.), тэорыі афіцыйнай народнасці (1833–1864 гг.), заходнерусізму (1864–1884 гг.), беларускай нацыянальнай ідэі (1884–1917 гг.) пры выяўленні думак прадстаўнікоў навукова-педагагічнай супольнасці беларускіх губерняў адносна выхаваўчай ролі айчыннай (роднай) гісторыі ў фарміраванні патрыятызму і асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў-ураджэнцаў Беларусі.

4. Выяўленне вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў змесце школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі па крытэрыю гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб’ектнасці беларускага этнасу (нацыі) і ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм.

5. Характарыстыка навукова-педагагічных асноў стварэння і вучэбна-метадычных аспектаў выкарыстання ў адукацыйным працэсе школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, звязанных з дыдактычным канструяваннем вучэбнага матэрыялу на аснове рэалізацыі такіх прынцыпаў, як навуковасць, сістэматычнасць, даступнасць, выхаваўчая накіраванасць, нагляднасць, свядомы і актыўны ўдзел вучняў у працэсе навучання.

Вядучы навуковы супрацоўнік
лабараторыі пачатковай адукацыі
навукова-метадычнай установы
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт С.В. Паноў

Подпись С.В. Панова удостоверяю
Начальник А.С. ВАЩИЛО
14.06.2023

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Аддзел кадраў і прававой работы

З водгукам азнаёмлены 16.06.2023 С.М. Бічанка

# ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА

аб дысертацыі Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча
«Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны, са спасылкай на вобласць даследавання пашпарту адпаведнай спецыяльнасці, зацверджанага ВАК**

Дысертацыя Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча на тэму «Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.» цалкам адпавядае заяўленай спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі. Дысертацыйнае даследаванне арыентавана на вырашэнне актуальнай для педагагічнай навукі праблемы ўдасканалення школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі. Дысертацыя адпавядае галіне – педагагічныя навукі. Вобласць даследавання пашпарту адпаведнай спецыяльнасці: пункт 4. Гісторыя педагогікі і адукацыі (аналіз гістарычнага развіцця інстытуалізаванай і неінстытуалізаванай практыкі адукацыі, дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і яе нарматыўна-прававога рэгулявання; вывучэнне станаўлення і развіцця педагагічных ідэй, канцэпцый, тэорый, педагагічнай спадчыны выдатных педагогаў мінулага).

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Актуальнасць даследавання абумоўлена мэтазгоднасцю ажыццяўлення гістарычна рэтраспектыўнага аналізу працэса стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. з пункту гледжання пераемнасці з сучаснай дзяржаўнай гістарычнай палітыкай, тэорыяй і практыкай стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. У педагагічнай навуцы эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. не з'яўлялася прадметам комплекснага даследавання, што актуалізавана сучасным этапам мадэрнізацыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

У дысертацыі, якая з'яўляецца вынікам самастойнага даследавання саіскальніка, метадалагічна абгрунтавана і распрацавана гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., што садзейнічае вырашэнню выяўленай аўтарам супярэчнасці паміж назапашаным вопытам дзяржаўна-ідэалагічнага рэгулявання, вучэбна-метадычнага забеспячэння працэсу стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. і адсутнасцю яго комплекснага сістэмнага аналізу, неабходнага як для эфектыўнага ажыццяўлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, так і для цэласнага асэнсавання сучаснага працэсу эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі.

Навізна вынікаў і навуковых палажэнняў праведзенага даследавання заключаецца:

у раскрыцці дзяржаўна-ідэалагічных, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчых, гісторыка-педагагічных асноў даследавання эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі;

у канструяванні гісторыка-педагагічнай мадэлі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.;

у выяўленні эвалюцыі канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі і поглядах педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў;

у вызначэнні асаблівасцей дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм;

у ахарактарызаванасці навукова-педагагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычных аспектаў, звязаных з яе выкарыстаннем у адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Абгрунтаванасць і верагоднасць дысертацыйных вывадаў і рэкамендацый забяспечваюцца:

– апорай тэарэтыка-метадалагічных асноў даследавання на дасягненні сучаснай педагагагічнай і гістарычнай навукі;

– верыфікацыяй тэарэтычных палажэнняў праз іх практычную рэалізацыю ў адукацыйнай практыцы;

– фармуляваннем зыходных пазіцый на аснове аб'ёмнага кола гісторыка-педагагічных крыніц (бібліяграфічны спіс змяшчае 260 найменняў);

– адпаведнасцю базавых палажэнняў заяўленым падыходам і прынцыпам даследавання;

– рацыянальным спалучэннем тэарэтычных і эмпірычных метадаў даследавання;

– выкарыстаннем метаду сістэмнага аналіза для комплекснай апрацоўкі вынікаў праведзенага даследавання;

– вызначэннем крытэрыяў кантэнт-аналізу зместавага напаўнення школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, якія патэнцыяльна ўплывалі на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці вучняў беларускіх губерняў (адлюстраванне беларускага этнагенезу, прызнанне гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларускага этнасу).

Дакладнасць атрыманых вынікаў праведзенага даследавання, абгрунтаванасць высноў і рэкамендацый забяспечаны: выразнасцю метадалагічных пазіцый, сістэмнасцю разгляду прадмета даследавання ў яго структурных, функцыянальных і працэсуальных характарыстыках; арганізацыяй даследавання на тэарэтычным і практычным узроўнях; узгадненнем метадалагічных падыходаў, вядучых ідэй, прынцыпаў, мэтаў і задач даследавання, якія выносяцца на абарону палажэнняў; прымянення комплекснай методыкі даследавання, адпаведнай логіцы навуковага пошуку.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанню**

Навуковая значнасць дысертацыйнага даследавання заключаецца ў выяўленні аўтарам на базе шырокага круга гісторыка-педагагічных крыніц XIX – пачатку XX ст. этапаў канцэптуалізацыі ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі і вызначэнні асаблівасцей дыдактычнага канструявання зместу вучэбна-метадычнай літаратуры па гісторыі Беларусі для пачатковай і сярэдняй школы ў адпаведнасці з патрабаваннямі Міністэрства народнай асветы і практыка-арыентаванымі поглядамі прадстаўнікоў педагагічнай супольнасці.

Практычная значнасць дысертацыі заключаецца ў тым, што атрыманыя вынікаў даследавання знайшлі прымяненне ў адукацыйным працэсе ўстаноў

дадатковай адукацыі дарослых і ўстаноў вышэйшай адукацыі, аб чым сведчаць акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ў ДУА "Акадэмія паслядыпломнай адукацыі" пры правядзенні перападрыхтоўкі па спецыяльнасці "Педагогіка дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі", у прыватнасці, рэалізацыі вучэбнай праграмы "Дадатковая адукацыя сродкамі музейнай педагогікі"; у ДУА "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы" пры правядзенні перападрыхтоўкі па спецыяльнасці "Экскурсійная дзейнасць ва ўстановах адукацыі", у прыватнасці, рэалізацыі вучэбнай праграмы "Музейная педагогіка і педагагічныя тэхналогіі ў экскурсійнай дзейнасці"; у УА "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова" пры правядзенні лекцыйных, практычных і семінарскіх занятках па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці".

Сацыяльна-эканамічная значнасць атрыманых вынікаў даследавання заключаецца ў распрацоўцы аўтарам канцэпцыі музея «Вучэбная кніга ў гісторыі адукацыі» (IX – XX стст.) і яе практычная рэалізацыя, што зафіксавана ў актах аб практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі ў адукацыйным працэсе ДУА "Акадэмія паслядыпломнай адукацыі".

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны для навукова-метадычнага забеспячэння працэсу стварэння сучаснай школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь, вывучэння гісторыі педагагічнай думкі і гістарычнай адукацыі; павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі; сістэмнага афармлення музейных экспазіцый, прысвечаных вучэбнаму кнігавыданню па гісторыі; распрацоўкі на аснове дзяржаўнай ідэалогіі навукова-педагагічнага механізму фарміравання, захавання і ўмацавання грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці беларускіх вучняў на сучасным этапе развіцця краіны. Атрыманыя вынікі даследавання з'яўляюцца актуальнымі для сучаснага стану і перспектыў развіцця вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Вынікі і высновы дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 14 публікацыях: 10 навуковых артыкулаў, апублікаваных ў выданнях (рэцэнзаваных часопісах і навуковых зборніках), уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, зацверджаным Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь, 4 публікацыі матэрыялаў навуковых і навукова-практычных канферэнцый. Агульны аб'ём аўтарскага тэксту апублікаваных работ па тэме дысертацыі складае 10,6 аўт. арк.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Дысертацыя аформлена ў адпаведнасці з патрабаваннямі да парадку афармлення кваліфікацыйнай навуковай працы, выкладзенымі ў Інструкцыі, зацверджанай Пастановай ВАК Рэспублікі Беларусь 22 жніўня 2023 года №5.

**Заўвагі па дысертацыі (пры іх наяўнасці), калі яны не паказваюцца ў структурных элементах водзыва аб дысертацыі**

Прадстаўленая дысертацыйная работа заслугоўвае высокай адзнакі. Разам з тым ёсць пытанні на ўдакладненне некаторых пазіцый і пажаданні. Будзем удзячныя аўтару за наступныя ўдакладненні:

1. Варта было б зрабіць абагульняючую выснову аб параўнанні асаблівасцей дыдактычнага канструявання вучэбных тэкстаў падручнікаў даследуемага перыяда мінуўшчыны і сучасных падручнікаў па гісторыі Беларусі: Што з таго, што было мае права быць сёння? Што знікла? Што з'яўляецца незаслужана (неапраўдана) забытым? Што засталося (захавалася) з тых часоў і выкарыстоўваецца ў сучаснасці? Што можна выкарыстаць з забытага ў перспектыве? Што павінна быць сугучным з сучаснасцю?
2. Варта было б удакладніць, якія з прааналізаваных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў адпавядаюць прынцыпам навуковасці, выхаваўчай накіраванасці, даступнасці; прынцыпам сістэматычнасці, нагляднасці, прынцыпу свядомага і актыўнага ўдзелу вучняў у працэсе навучання; тагачасным патрабаванням да дыдактычнага канструявання структуры вучэбнага выдання.
3. Варта было б абгрунтаваць пералік, вызначаных аўтарам крытэрыяў кантэнт-аналізу зместу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, якія патэнцыяльна ўплывалі на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці вучняў беларускіх губерняў.

**Адпаведнасць (неадпаведнасць) навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Аналіз зместу дысертацыі дазваляе канстатаваць, што дысертацыя Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча ўяўляе сабой цэласнае, лагічна завершанае даследаванне. Аўтар мае неабходныя навукова-даследчыя кампетэнцыі і навукова-метадычную падрыхтоўку, што сведчыць пра належны ўзровень навуковай кваліфікацыі і метадалагічную культуру саіскальніка: фармулёўка актуальнасці тэмы, вызначэнне праблемы з улікам выяўленых дысертантам супярэчнасцей з мэтай устанаўлення праблемнага поля даследавання, яго мэты і задачы, навізны, навуковай, практычнай значнасці вынікаў дысертацыі, што выступаюць агульнапрызнанымі паказчыкамі для ацэнкі якасці даследавання.

Дасведчанасць, навуковая скрупулёзнасць дазволілі саіскальніку выявіць сістэмную гісторыка-педагагічную ўзаемаабумоўленасць канцэптуальна-ідэалагічнага, структурна-зместавага і навукова-метадычнага кампанентаў працэсу стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Вучоная ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі можа быць прысуджана Бітчанка Сяргею Міхайлавічу за сукупнасць навуковых вынікаў:

1. Абгрунтаванне тэарэтыка-метадалагічных асноў даследавання, якія ўключаюць дзяржаўна-ідэалагічныя, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя і гісторыка-педагагічныя асновы даследавання.
2. Распрацоўку гісторыка-педагагічнай мадэлі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі, якая уключае ў сябе канцэптуальна-ідэалагічны (вынікі ўрадавай палітыкі ў галіне гістарычнай адукацыі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.;), структурна-зместавы (асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры і зместу школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі), навукова-метадычны кампаненты (навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.).
3. Канцэптуальна абгрунтаваную рэканструкцыю генезісу этапаў дзяржаўна-ідэалагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі: 1803–1833 гг.: рэалізацыя палітыкі паланізацыі і паланафільства, калі адукацыйны працэс грунтаваўся на нарматыўных прававых актах часоў дзейнасці Адукацыйнай камісіі; 1833–1864 гг.: рэалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць» ва ўмовах пашырэння тэорыі афіцыйнай народнасці; 1864–1884 гг.: «оффиціально-охранительный», накіраваны на дэпаланізацыю адукацыі на аснове канцэпцыі заходнерусізму і ўзмацненне русіфікацыйнай накіраванасці асветы з непрызнаннем самастойнасці беларускага этнасу, яго культуры, мовы і права на стварэнне нацыянальнай школы; 1884–1917 гг.: афармленне ідэі замацавання вялікарускай самасвядомасці на аснове канцэпцыі заходнерусізму з аднначасовым станаўленнем беларускай нацыянальнай ідэі.
4. Абгрунтаванне асаблівасцей дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі

для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. (структура вучэбных тэкстаў прадугледжвала асноўны, дадатковы, тлумачальны кампаненты, якія складаліся з апарату арганізацыі засваення зместу і апарату арыенціроўкі; ўключала ў сябе рубрыкацыю, ілюстратыўную нагляднасць, картаграфічныя матэрыялы, бібліяграфічныя і біяграфічныя ўказальнікі, слоўнікі; вучэбныя тэксты ўяўлялі сабой апісанні, апавяданні, развважанні, пададзеныя па індуктыўным ці дэдуктыўным алгарытме як спосабах аўтарскага выкладу зместу).

5. Абгрунтаванне навукова-педагагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, звязанных з дыдактычным канструяваннем вучэбнага матэрыялу ў падручніках (вучэбных дапаможніках) на аснове рэалізацыі такіх прынцыпаў адбору зместу вучэбнага матэрыялу, як навуковасць, сістэматычнасць, выхаваўчая накіраванасць, нагляднасць, свядомы і актыўны ўдзел вучняў у працэсе навучання, даступнасць (адэкватнасць маўленчага афармлення тэксту падручнікаў часу іх стварэння), і ўлічвалі патрабаванні педагагічнай навукі да структуры вучэбных тэкстаў.

Загадчык кафедры педагогікі
ўстановы адукацыі "Магілёўскі
дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.А. Куляшова", доктар
педагагічных навук, прафесар А.І. Снапкова

Подпись Снопковой Е.И.
заверяю
рук. нач. отдела кадров
учреждения образования
«Могилевский государственный
университет имени А.А. Кулешова»
Макаровская Т.В.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова"

З водгукам азнаёмлены 16.06.2023 С.М. Бітнелька